ў суседнюю вёску яшчэ было можна, але як жа вярнуцца дахаты недзе пад поўнач?

Пяшчаная разьежджаная дарога ў полі альбо лесе, зрэдзьчасу жвіроўка, у вёсках брукаванка — ня надта каб было дзе разагнацца *роварам* на Беласточчыне ў 60-я і 70-я гады. Дый цяпер асфальтовак пабольшала не нашмат. Але народ езьдзіў на *роварах* часта й густа. *Ровар* — аўтамашына дзятвы і бядоты. У згаданым часе аднаго й другога на Беласточчыне было адволі.

Дзядулі, што помнілі „першага і другога немца“, казалі, што цяперашнія рускія й польскія *ровары* — гэта барахло ў параўнаньні зь нямецкімі. „Нямецкі, о-то-то быў *ровар*!“ — пераконвалі. Але колькі я ні прыглядаўся да іхніх самакатаў, на якіх яны езьдзілі нядзелькамі ў царкву, мне ніколі ня ўбачыўся ні адзін „о-то-то“ *ровар*...

Мабыць, усе „о-то-то“ *ровары* існуюць адно ў нейчым маленстве...

# Розум

***Анатоль Вярцінскі***

Гэта тое, што перш за ўсё робіць чалавека чалавекам. Таму яго і вызначаюць як *homo sapiens*, таму мы найперш і зьяўляемся боскімі стварэньнямі. Самая сумная канстатацыя ў дачыненьні да каго-небудзь з нас: „*Бог яму розуму ня даў*“. Яшчэ гавораць: „*Калі Бог хоча каго пакараць, ён пазбаўляе яго розуму*“.

Праўда (гэта яшчэ адзін сумны факт), ня кожнаму дадзена жыць ды кіравацца *сваім розумам*. Менавіта сваім, уласным, а не чужым — пазычаным у суседа, у так званага старэйшага брата ці перанятым у наваяўленага правадыра.

*Розум* — пільны вартавы жыцьцёвага ладу. Сон *розуму* нараджае пачвар. Ён, *розум*, супастаўляе факты, параўноўвае зьявы, асэнсоўвае досьвед, праводзіць мяжу паміж праўдай і хлусьнёй, паміж рэальнымі рэчамі і хімэрамі, робіць высновы.

*Розум* — перадумова духоўнасьці і аснова творчасьці, ствральнай дзейнасьці. Менавіта *розуму* належыць галоўнае інжынэрнае правіла, згодна зь якім эканоміць можна на ўсім, акрамя падмурка.

*Розум*, як нехта тонка заўважыў, ня будзе ставіць пытаньне: даганяць ці адставаць, разлучацца ці аб'ядноўвацца. Ён будзе выходзіць з таго, што лепей, а што горш, што дабро, а што зло. Ён з магчымых варыянтаў выбірае аптымальны.

На пастамэнце помніка Пушкіну, якім маскоўская мэрыя абдарыла менскія гарадзкія ўлады, некалькі дзён красаваўся напісаны юначым почыркам крылаты пушкінскі радок: „Няхай жыве *розум*, хай зьнікне імгла“. Сапраўды, няхай.

# Рокаш

***Павал Марціновіч***

У мове XX стагодзьдзя *рокаш* — паўстаньне, мяцеж, забурэньне — слова архаічнае і досыць рэдкае. Ува ўжытак яно вярнулася зь лёгкай рукі Караткевіча.